лекс размешчаны ва ўсх. частцы Цытадэлі. Галоўны ўваход уяўляе сабой праём у выглядзе 5-канцовай зоркі ўманалітным жалезабетонным масіве, які абапіраецца на вал і сцены казематаў. На вонкавым баку падмурка ўстаноўлена дошка з тэкстам Указа Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 8.5.1965 аб прысваенні Брэсцкай крэпасці ганаровага звання «Крэпасць-герой». Ад гал. ўвахода алея вядзе цераз мост да пл. Цырыманіялаў, дзе адбываюцца масавыя ўрачыстасці. Злева ад моста скульпт. кампазіцыя «Смага» — фігура сав. воіна, які цягнецца з каскай да вады. Да пл. Цырыманіялаў прымыкаюць будынак *Брэсцкай крэпасці-героя музея* і руіны Белага палаца. Кампазіцыйным цэнтрам ансамбля з'яўляецца гал. манумент «Мужнасць» — пагрудная скульптура воіна і штык-абеліск. На адваротным баку манумента рэльефныя кампазіцыі, якія адлюстроўваюць асобныя эпізоды гераічнай абароны крэпасці. З манументам арганічна звязаны трыбуна і 3-ярусны некропаль, дзе пахаваны астанкі 850 чал., на ўстаноўленых тут мемарыяльных плітах — імёны 224 байцоў. Побач з руінамі б. інжынернага ўпраўлення гарыць Вечны агонь. Перад ім — адлітыя з бронзы словы: «Стаялі насмерць, слава героям!» Недалёка ад Вечнага агню знаходзіцца Мемарыяльная пляцоўка гарадоў-герояў Сав. Саюза, на якой пад гранітнымі плітамі ўстаноўлены капсулы з зямлёй гарадоў-герояў. На сценах казарм, руінах, цагляных і мураваных глыбах, на спец. падстаўках мемарыяльныя дошкі ў выглядзе адрыўных лісткоў календара 1941, якія з'яўляюцца своеасаблівай хронікай гераічных падзей. Пешаходныя дарожкі і плошча перад гал. уваходам пакрыты чырвоным пластабетонам. Мастацка-дэкаратыўнае чырвона-бела-зеленаватае падсвечванне вечарам і гукавое афармленне (гучанне песні А. Аляксандрава «Свяшчэнная вайна», урадавага паведамлення пра вераломны напад на СССР войск фаш. Германіі, мелодыі Р. Шумана «Летуценні») надаюць асаблівую вастрыню ўспрымання комплексу. *Л. Г. Лапцэвіч.*

**БРЭСЦКАЯ МУЖЧЫНСКАЯ ГІМНАЗІЯ**, сярэдняя агульнаадук. навучальная ўстанова ў 1865—1915. Заснавана ў 1865 у Брэсце як 4-класная прагімназія. Налічвала каля 160 навучэнцаў. У 1901 пераўтворана ў гімназію. Складалася з 8 асноўных, 4 паралельных (1—4-ы класы) і падрыхтоўчага класаў. Колькасць навучэнцаў ад 450 да 520. Вывучаліся рус., франц., ням., лац. мовы, гісторыя, геаграфія, прыродазнаўства, матэматыка. У праграму ўваходзілі ўрокі па маляванні, чыстапісанні, музыцы, спевах і інш. Праваслаўны святар і ксёндз выкладалі Закон Божы, а законавучыцель іудзейскай веры — іудзейскае веравучэнне. Плата за навучанне ў гімназіі складала 55—65 руб., у падрыхтоўчым класе 50—60 руб. у год. На ўтрыманне гімназіі адпускалася ў год у залежнасці ад колькасці навучэнцаў: з дзярж. казны 25—35 тыс. руб., з сум платы за навучанне 12—22 тыс., з гар. казны — 300—800 руб. Зараз у будынку



Будынак Брэсцкай мужчынскай гімназіі. Пачатак 20 ст.

б. гімназіі размешчаны адзін з навуч. карпусоў *Брэсцкага педагагічнага інстытута* імя А. С. Пушкіна.

*Літ.* Памятная кннжка Виленского учебного округа на 1883—84 учебный год. Вильна, 1884; Памятиая кннжка Виленского учебного округа за 1911—1912 учебный год. Вильна, 1912. *М. М. Забаўскі.*

**БРЭСЦКАЯ ПРАВАСЛАЎНАЯ ЕПАРХІЯ.** Існуе з 1840. Да канца 16 ст. тэр. Брэстчыны знаходзілася пад уладай епіскапаў уладзіміра-валынскіх, якія часам называліся «епіскапамі ўладзімірскімі і берасцейскімі». У 1596—1630-я гады ўсе яе парафіі перайшлі ў унію, у 1765 утворана *Брэсцкая уніяцкая епархія.* Толькі некалькі храмаў і манастыроў засталіся праваслаўнымі. Епархія ўтворана ў 1840 з былой Брэсцкай уніяцкай епархіі (тэр. Гродзенскай губ.) як епіскапства (вікарыят) *Літоўскай праваслаўнай епархіі:* брэсцкія епіскапы адначасова былі вікарыямі (намеснікамі) архіепіска-



Брэсцкая крэпасць-герой. Галоўны ўваход.



Брэсцкая крэпасць-герой. Манумент «Мужнасць».